– в максимальной степени учитывать специфику подготовки всех направлений образовательного процесса путем перераспределения приоритетов и включения новых видов учебно-воспитательной деятельности;

– сохранить возможность сравнения между собой факультетов и кафедр по успеваемости студентов.

Введение балльно-рейтинговой системы, по мнению исследователей, делает более объективной оценку успеваемости студентов в целом [4, с. 17]. Она позволяет оценить совокупные академические успехи студента и дать более глубокий анализ результатов обучения, оценить те области деятельности студента, которые не может охватить академическая оценка, и акцентировать внимание студента на наиболее важных видах деятельности.


1. *Аванесов, В. С.* Научные проблемы тестового контроля знаний / В. С. Аванесов. – М. : Высш. шк., 1994. – 135 с.

2. Инновационные процессы в образовании. Основные документы и материалы Болонского процесса. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2006. – 217 с.

3. *Симонов, В. П.* Педагогический менеджмент : ноу-хау в образовании / В. П. Симонов. – М. : 2007. – 257 с.

4. *Третьякова, Т. Н.* Теоретические основы управления профессиональной подготовкой специалистов / Т. Н. Третьякова. – Челябинск : ЮУрГУ, 2000. – 198 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


**В. М. Бігеза,**
*дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*


# АКТУАЛІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ЯК УМОВА ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ ПА РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ

Фундаментальная задача вышэйшай адукацыі заключаецца ў фарміраванні творчай асобы спецыяліста, здольнага да саморазвіцця, самаадукацыі і прафесійнай інавацыйнай дзейнасці.

Імкліва нарастаючы паток інфармацыі, хуткае маральнае абясцэньванне атрыманых раней ведаў і з'яўленне новых, ус-

вядомленая патрэбнасць сучаснага грамадства ў гібкіх, адаптыўных сістэмах адукацыі робяць асабліва важным уменне атрымліваць новыя веды актыўна і самастойна. Гэта забяспечвае адаптыўнасць будучых спецыялістаў да непазбежных перамен у прафесіі, спецыяльнасці, спецыялізацыі.

У сувязі з гэтым самастойная работа студэнтаў (СРС) разглядаецца ў якасці найважнейшага элемента новых адукацыйных тэхналогій і таму з'яўляецца адным са спосабаў забеспячэння новага адукацыйнага стандарту. Ён павінен ствараецца на аснове новых падыходаў да зместу і форм СРС, да ролі і функцыі выкладчыка ў яе арганізацыі.

Даследчыкі праблемы самастойнай работы па-рознаму падыходзяць да вызначэння гэтага паняцця. Названую работу вызначаюць як метад навучання (Ю. К. Бабанскі, В. Г. Асмалоўскі), сродак навучання (П. І. Підкасісты), форму арганізацыі самастойнай дзейнасці (Т. І. Шамава), як асобую сістэму ўмоў навучання, якая арганізавана выкладчыкам і з'яўляецца аспектам яго дзейнасці; як пазнавальную дзейнасць, якая выконваецца студэнтамі самастойна пад кіраўніцтвам выкладчыка (М. І. Піскуноў). Падкрэслім, што кіруемую СРС трэба разглядаць як асобым чынам арганізаваную мэтанакіраваную дзейнасць выкладчыка і студэнта, якая ўключае наступныя этапы: падрыхтоўчы, арганізацыйны, матывацыйна-дзейсны і кантрольна-ацэначны [1, с. 8–12].

Кожны з названых этапаў у выніку накіраваны на абуджэнне пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Для арганізацыі працэсу пазнавальнай дзейнасці неабходна выкарыстоўваць такія тэхналогіі і метады навучання, якія б дазволілі засвойваць новыя веды і самастойна набываць іх у практычнай дзейнасці. Менавіта таму засваенне і абагульненне новых ведаў, фарміраванне ўменняў самастойна здабываць інфармацыю становіцца не толькі асноўнай мэтай навучэнца, але і адным са сродкаў інтэлектуальнага развіцця студэнтаў. Гэта ўлічваецца пры арганізацыі СРС у рамках рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу, пры здзяйсненні якога ўзнікае дыялектычнае спалучэнне фундаментальнасці падрыхтоўкі і яе практычнай накіраванасці.

Відавочна, што арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у рамках вышэйназванага падыходу – гэта адзін з напрамкаў, якія дазваляюць перайсці ад ведавай парадыгмы адукацыі да кампетэнтнаснай – ад варыянта «даць аду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кацыю» да варыянта «атрымаць адукацыю». Але самастойная работа – гэта не толькі пазнавальная дзейнасць, якая звязана з засваеннем прафесійных ведаў. Гэта ў сутнасці перажыванне практычнага вопыту у кантэксце фарміруемых кампетэнцый [2].

Да асноўных прынцыпаў самастойнай работы студэнтаў можна аднесці комплекснасць, непарыўнасць і сістэмнасць. Згодна з гэтым прынцыпам, у залежнасці ад курса, на якім вучыцца студэнт, спецыфікі вывучаемай дысцыпліны заданне для самастойнай работы можа быць розным.

Улічваючы той факт, што прафесійная дзейнасць студэнтаў спецыялізацыі «бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва» мае шэраг асаблівасцей у параўнанні з іншымі спецыялізацыямі (неабходнасць ведання тэорыі і практыкі выхавання, асаблівасцей псіхолага-педагагічнага развіцця дзіцяці, псіхалогіі зносін, псіхолага-педагагічнага ўздзеяння кніг і чытання на чытача і інш.), а сучасныя адукацыйныя тэхналогіі павінны быць арыентаваны на набыццё будучым спецыялістам комплексу ключавых кампетэнцый і адпаведных ім асобасных якасцей, мы лічым мэтазгодным СРС арганізаваць у выглядзе сістэмы комплексных вучэбна-прафесіянальных заданняў. Такі падыход будзе садзейнічаць мадэляванню рэальнай прафесійнай дзейнасці бібліятэкара, які працуе з дзецьмі. Менавіта ў такой сістэме самастойнай работы студэнтаў ствараюцца ўмовы для выкарыстання інфармацыйна-дзейнаснага, кампетэнтнаснага падыходаў, якія на практычным узроўні могуць быць паказаны ў выглядзе сістэмы тэарэтычных ці практычных заданняў.

Відавочна, што важным аспектам СРС з’яўляецца яе індывідуалізацыя, якая патрабуе ад выкладчыка вызначэння ўзроўню інфармацыйнай культуры студэнта, рэгулярнасці кансультацый і адначасова ў большай ступені дазваляе вызначыць псіхолага-педагагічныя асаблівасці навучэнцаў з мэтай стварэння аптымальных умоў для творчага развіцця асобы будучага спецыяліста. Намі прадугледжана правядзенне калёквіумаў, выкананне пошукавых заданняў, падрыхтоўка дакладаў і рэфератаў па выніках знаёмства з неапублікаванымі крыніцамі бібліяграфічнай дзейнасці і інш.

На наш погляд, цікавай формай самастойнай работы студэнтаў пры вывучэнні дысцыплін спецыялізацыі з’яўляецца творчая работа малымі групамі. Група студэнтаў (2–3 чалавекі)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выбірае прапанаваную тэму, вывучае яе на тэарэтычным і практычным узроўнях, а затым ідзе markdownрознабаковае абмеркаванне вынікаў праведзенага даследавання на практычных занятках у выглядзе навукова-практычнай канферэнцыі, у ходзе якой выкладчык і студэнты задаюць пытанні на ўдакладненне, практычнае выкарыстанне матэрыялу на рабочых месцах. Акрамя таго, выкладчыкамі кафедры прадугледжаны паглыблены аналіз навуковай літаратуры па тэмах дысцыплін спецыялізацыі: канспектаванне, складанне анатацый ці рэцэнзій (супастаўленне розных пунктаў гледжання, пазіцыя аўтара і г. д.) на крыніцу.

Падкрэслім, што менавіта навуковыя даследаванні з'яўляюцца найважнейшай часткай сучаснага адукацыйнага працэсу. Яны не толькі даюць фундаментальныя веды, але і навыкі іх прымянення для аналізу рэальных падзей, прыняцця сацыяльных і іншых рашэнняў. Тут мы маем на ўвазе падбор крыніц да вывучаемых тэм, падрыхтоўку навуковых дакладаў, напісанне курсавых, дыпломных работ – усё гэта знаёміць з прыёмамі навуковага даследавання, прывівае навыкі навуковай работы і ў выніку актывізуе пазнавальную дзейнасць і псіхафізічныя працэсы, якія ляжаць у аснове творчай, пошукавай, даследчай работы (А. М. Лявонцьеў).

Безумоўна, актуалізацыя СРС у рамках прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі дасць станоўчы вынік пры наяўнасці ўстойлівай матывацыі, якая будзе садзейнічаць фарміраванню стойкіх пазнавальных інтарэсаў. Адзін з самых моцных матывіруючых фактараў у гэтым сэнсе – сур'ёзная падрыхтоўка да далейшай прафесійнай дзейнасці. Іншымі фактарамі з'яўляюцца: карыснасць выконваемай працы, разгляд аб'ектыўна цікавага матэрыялу, удзел у творчай дзейнасці, а таксама выкарыстанне матывіруючых фактараў кантролю ведаў (рэйтынгавая сістэма, тэсты і г. д.), заахвочванне студэнтаў за поспехі ў вучобе і творчай дзейнасці (прэміі, стыпендыі і г. д.), індывідуалізацыя заданняў, іх сістэматычнае абнаўленне; выкарыстанне сучасных электронных сродкаў выкладання і кантролю засваення ведаў і г. д.

Актуалізацыя СРС пры падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі абумоўлена таксама інавацыйнымі падыходамі, якія здзяйсняюцца шляхам выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. Найбольш эфектыўнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з іх з'яўляюцца выкарыстанне Інтэрнэту для выканання індывідуальных заданняў, падрыхтоўка прэзентацый у Power Point, вывучэнне інтэрнэт-рэсурсаў у галіне літаратуры для дзяцей і юнацтва, цікавага вопыту інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці дзіцячых бібліятэк (стварэнне комплексных шматмэтавых праграм, распрацоўка праектаў і інш.), правядзенне адзін раз у семестр вучэбных канферэнцый з выкарыстаннем мультымедыйных сродкаў. Так, напрыклад, пры складанні анатаванага тэматычнага спіса, студэнт папярэдне кансультуецца з выкладчыкам, складае канспект на рабочым стале, а потым уключае анатацыю ў спіс. У гэтым выпадку традыцыйная работа з першакрыніцамі набывае характар навуковага асэнсавання практычнага матэрыялу, і студэнт засвойвае навык сістэматызацыі прачытанага і замацоўвае веды па напісанні анатацыі. Пры правядзенні канферэнцый студэнты ўдзельнічаюць у дыскусіях, выказваюць асабісты пункт гледжання, іх заахвочваюць да самастойнага мыслення.

Адзначым таксама, што вырашэнне пытання актуалізацыі СРС прадугледжвае добрае вучэбна-метадычнае і матэрыяльнае забеспячэнне.

Безумоўна, паспяховая арганізацыя СРС у свеце сённяшніх патрабаванняў прадугледжвае высокі ўзровень ведаў выкладчыка не толькі па выкладаемых дысцыплінах, але і на ўзроўні псіхолага-педагагічных навук.

Неабходна ўдасканальванне сістэмы інфармацыйных камунікацый ва ўніверсітэце, вучэбных планаў па змесце і логіцы праходжання дысцыплін, распрацоўка і ўкараненне новых форм і метадаў кантролю за СРС.

Такім чынам, актуалізацыя самастойнай работы будучых бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі будзе садзейнічаць развіццю новых творчых здольнасцей на ўсіх этапах навучання, павышэнню інтэлектуальнага патэнцыялу, актыўнасці, закладанню асноў будучай самастойнай прафесійнай дзейнасці.

---

1. *Козлова, Н. В.* Личностно-профессиональное становление: психолого-акмеологический подход / Н. В. Козлова. – Томск : Изд-во ТПУ, 2007. – 201 с.

2. *Лобанов, А. П.* Управляемая СРС в контексте инновационных технологий / А. П. Лобанов. – Минск : РИВШ, 2005. – 87 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ